


# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

## ВЫПУСКУ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ВЫДАННЯЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

## НА 2021 ГОД

Падпіска на выданні ажыццяўляецца на дагаворнай аснове.

## Заказ выданняў:

Заказ на выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адсылайце на e-mail: nbb-izdat@mail.ru; edit@nlb.by або на адрас:

*Выдавецкі аддзел,*
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі,*
*пр. Незалежнасці, 116,*
*220114, г. Мінск.*

Калі падпіску за бібліятэку аплачвае аддзел культуры выканкама, то дагавор павінен заключацца **паміж Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і аддзелам культуры выканкама.**

Па пытаннях аплаты выданняў звяртайцеся па тэл.: (+375 17) 293 25 76, 293 28 40.

## Набыць выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі магчыма:

Нацыянальная бібліятэка Беларусі
Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск
Тэл. (+375 17) 293 28 21
Факс (+375 17) 266 37 23

У кіёску Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (за наяўны разлік)
Тэл. (+375 17) 293 28 52

РУП «Акадэмічная кніга»
Пр. Незалежнасці, 72, 220012, г. Мінск
Тэл./факс: (+375 17) 292 00 52, 292 46 52, 292 50 43

# ЗМЕСТ

ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ 4

КАЛЯНДАРНЫ ПЛАН
выхаду ў свет інфармацыйных выданняў
Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 2021 г. 11

# Друкаваныя выданні

## 1. Беларусь вачыма бібліёграфа

*Адказны за выпуск Градоўкіна І.У.*




Навукова-папулярнае выданне «Беларусь вачыма бібліёграфа» прысвечана 60-гадоваму юбілею бібліяграфічнага бюлетэня «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку». Кніга створана па матывах дадаткаў, змешчаных на старонках бюлетэня ў апошнія 30 гадоў. Складаецца з матэрыялаў беларусазнаўчага характару – замалёвак, якія адлюстроўваюць нашу нацыянальную гісторыю, культуру, побыт. Выданне адрасавана шырокаму колу чытачоў.

## 2. Бібліятэчны веснік: зборнік артыкулаў. Вып. 13

*Адказны за выпуск Пшыбытка М.Г.*




Чарговы выпуск навуковага зборніка прысвечаны пытанням фарміравання сучаснай бібліятэчна-інфармацыйнай прасторы, перспектывам развіцця бібліятэк.

Прызначаны спецыялістам у галіне бібліятэчнай справы і інфармацыйных тэхналогій, выкладчыкам, аспірантам і магістрантам, кіраўнікам органаў упраўлення культуры.

## 3. Бібліятэчны свет: часопіс*

*Галоўны рэдактар Кірухіна Л.Г.*




Часопіс, заснавальнікамі якога з'яўляюцца Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, выдаецца з мэтай навукова-практычнага і навукова-метадычнага забеспячэння бібліятэчнай справы, а таксама раскрыцця творчага і навуковага патэнцыялу спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы і інфармацыйных тэхналогій.

Прадстаўляе інтарэс для тых, хто вывучае бібліятэчную справу, гісторыю, краязнаўства і культуру Беларусі.

## 4. Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 24

*Адказны за выпуск Гарковіч Н.В.*




Чарговы выпуск навуковага зборніка будзе прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. У ім будуць адлюстраваны матэрыялы па праблемах вывучэння, захоўвання і выкарыстання дакументальнай спадчыны Беларусі, гісторыі рукапіснай і друкаванай кнігі, архіўных дакументаў, бібліятэчнай справы, бібліяграфазнаўства, культуралогіі, падрыхтаваных беларускімі і замежнымі даследчыкамі кніжнай культуры. Зборнік артыкулаў з'яўляецца навуковым выданнем, якое рэцэнзуецца і ўключана ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па педагагічных, гістарычных навуках і культуралогіі. Матэрыялы зборніка ўводзяць у навуковы ўжытак унікальныя дакументальныя помнікі, новыя дакументы, факты і звесткі, звязаныя з гісторыяй кнігі і культуры Беларусі, і будуць карыснымі ўсім, хто цікавіцца нашай спадчынай.

* Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты «Газеты и журналы Республики Беларусь». Індэксы выдання – 74895 (інд.), 748952 (вед.).

## 5. Интегрированные информационно-поисковые системы и сервисы библиотек.
Серия “БиблиоКонсультант”, вып. 10

*Ответственный за выпуск Рысева Ж.С.*




В издании представлен анализ глобальной цифровой информационной среды, определены задачи по повышению качества информационно-поисковых систем библиотек и реализации доступа к онлайн-ресурсам. Изложен зарубежный и отечественный опыт формирования сводных электронных каталогов библиотек, использование интегрированного поиска в информационных системах современных библиотек. Издание предназначено для специалистов учреждений сферы культуры и архивной деятельности, студентов высших учебных заведений соответствующего профиля, а также всех, кто интересуется проблемами формирования и использования информационно-поисковых систем в библиотеках.

## 6. Інструкцыя па ўліку і захаванасці фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.
Серыя “БібліяКансультант”, вып. 11

*Адказны за выпуск Пераверзева Ю.А.*




«Інструкцыя па ўліку і захаванасці фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі» ўстанаўлівае адзіныя правілы ўліку і захаванасці дакументаў, якія складаюць фонды і калекцыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, і з’яўляецца абавязковай для прымянення.

Вызначаны парадак паступлення дакументаў (у тым ліку электронных дакументаў сеткавага распаўсюджвання) у фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, асаблівасці ўліку розных відаў дакументаў, рэжым

іх захавання, праверкі і спісання. Прыведзены ўзоры старонак інвентарнай кнігі і кнігі сумарнага ўліку, актаў. Вызначаны тэрміны іх захавання, парадак запаўнення.

Абмеркавана і зацверджана Фондавай камісіяй Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

## **7. Краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк: ствараем супольна і якасна.** Серыя «БібліяКансультант», вып. 12.

*Адказны за выпуск Пугачова С.А.*




У навукова-практычным зборніку адлюстраваны метадычны матэрыял у дапамогу выкарыстання міжнароднай сістэмы «Універсальная дзесятковая класіфікацыя» (УДК) на беларускай мове і аўтарытэтных запісаў для сэнсавай апрацоўкі краязнаўчых і краіназнаўчых дакументаў, арганізацыі адпаведных фондаў у бібліятэках Беларусі.

Асноўную частку зборніка займаюць супастаўляльныя табліцы, у якіх адлюстраваны  дзяленні «Тыпавой схемы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь» (Мінск, 1994) і адпаведныя ім раздзелы УДК на беларускай мове (Мінск, 2016). Табліцы прызначаны аказаць дапамогу бібліятэкам краіны пры пераходзе да выкарыстання сучаснага сродку індэксавання дакументаў – УДК замест «Тыпавой схемы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь» (Мінск, 1994).

У зборніку знайшлі адлюстраванне нацыянальныя прыклады прымянення УДК. Табліца з  пералікам найбольш дакладных прыкладаў выкарыстання індэксаў УДК прадстаўляе ўсе галоўныя класы УДК для сэнсавай апрацоўкі дакументаў па гуманітарных, грамадскіх, прыродазнаўчых і прыкладных навуках.

У якасці дапаможнага матэрыялу зборнік змяшчае масіў сучасных адміністрацыйна-тэрытарыяльных дзяленняў Рэспублікі Беларусь, які ўключае 253 тапанімічныя адзінкі. Сярод іх: вобласці, раёны, раённыя цэнтры, гарады абласнога падпарадкавання, а таксама адміністрацыйныя раёны г. Мінска. Увесь масіў падзелены на асноўныя блокі па абласцях. Для кожнай вобласці прадстаўлены найменні ўсіх раёнаў, раённых цэнтраў, гарадоў абласнога падпарадкавання ў алфавітным парадку з адпаведным вызначальнікам месца для кожнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

Зборнік змяшчае таксама блок індэксаў УДК з улікам афіцыйна прынятай на сённяшні дзень перыядызацыі гісторыі Беларусі. Дэталізацыя раздзела УДК «94(476) Гісторыя Беларусі» абапіраецца на метадалагічную базу сучасных даследаванняў айчыннай гістарычнай навукі, сучасныя падыходы да перыядызацыі гісторыі Беларусі.

У канцы зборніка змяшчаюцца адказы на некаторыя пытанні бібліятэк Беларусі, якія выкарыстоўваюць і якія не выкарыстоўваюць у практычнай дзейнасці УДК.

Зборнік будзе запатрабаваны для сістэматызацыі дакументаў, арганізацыі дакументных фондаў і пошуку інфармацыі. Ён можа таксама выкарыстоўвацца ў метадычнай і вучэбнай рабоце пры правядзенні семінараў, чытанні адпаведных лекцыйных курсаў у сістэме падрыхтоўкі кадраў і павышэння кваліфікацыі для вышэйназваных устаноў.

## 8. Материалы VIII Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры»

*Ответственный за выпуск Есис Н.С.*




Сборник содержит материалы Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры», который проводит Национальная библиотека Беларуси. Публикуются доклады известных специалистов крупнейших библиотек, научно-исследовательских учреждений, представителей других организаций Беларуси и зарубежных стран, посвященные актуальным вопросам развития библиотечного дела.

## 9. Матэрыялы XVII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў

*Адказны за выпуск Гарковіч Н.В.*




Зборнік складаецца з матэрыялаў XVII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, якія пройдуць у красавіку 2021 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Публікуюцца даклады вядомых даследчыкаў і спецыялістаў нацыянальных і буйнейшых бібліятэк, музеяў, архіваў, навучальных і навукова-даследчых устаноў Беларусі і замежных краін, прысвечаныя гісторыі і сучаснасці нацыянальнай кніжнай культуры, развіццю асветніцкіх традыцый Беларусі.

## 10. Новыя кнігі: па старонках беларускага друку**

*Адказны за выпуск Градоўкіна І.У.*




Штомесячны ўніверсальны бібліяграфічны бюлетэнь інфармуе пра новыя кнігі беларускіх выдавецтваў, найбольш значныя артыкулы з рэспубліканскай перыёдыкі, а таксама рэцэнзіі на беларускія выданні.

У якасці дадаткаў друкуюцца біяграфічныя спісы або агляды, прысвечаныя значным гістарычным падзеям і актуальным пытанням сучаснага развіцця Беларусі, «Беларускі каляндар, … год», а таксама матэрыялы да юбілеяў выдатных дзеячаў краіны, шэрагу арганізацый і ўстаноў, што складаюць аснову эканомікі, культуры, навукі і асветы Беларусі.

Прызначаны ў дапамогу прафесійнай дзейнасці работнікаў бібліятэк, іншых культурных і асветных устаноў, а таксама студэнтам, навучэнцам і ўсім неабыякавым да гісторыі, культуры і сучаснага жыцця сваёй краіны, тым, хто адчувае неабход-

** Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты «Газеты и журналы Республики Беларусь». Індэксы выдання – 74972 (інд.), 749722 (вед.).

насць аператыўна атрымліваць патрэбную інфармацыю для павышэння агульнай і прафесійнай адукацыі, самаадукацыі і арганізацыі вольнага часу.

*Тэмы дадаткаў на 2021 г.:*

№ 1. Даты беларускага календара.
№ 2. Даты беларускага календара.
№ 3. Барысаў – культурная сталіца Беларусі 2021 г.
№ 4. Міфы, легенды і паданні беларусаў.
№ 5. Даты беларускага календара.
№ 6. Даты беларускага календара.
№ 7. З гісторыі адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі.
№ 8. Беларускі каляндар, 2022 год.
№ 9. Даты беларускага календара.
№ 10. Всемирный календарь (юбиляры 2022 года).
№ 11. Беларусь у сусветным друку.
№ 12. Даты беларускага календара.

## 11. «Роман Степанович Мотульский»: биобиблиографический указатель

*Ответственный за выпуск Суша А.А.*




Биобиблиографический указатель посвящен выдающемуся представителю библиотечного дела, руководителю одной из самых передовых национальных библиотек мира, доктору педагогических наук, профессору Роману Степановичу Мотульскому. Издание освещает основные итоги его научной, организационной, педагогической и практической деятельности.

Биобиблиографический указатель включает факты биографии и профессиональной деятельности руководителя Национальной библиотеки Беларуси, главной хранительницы книжных изданий, итоги научных проектов, хронологический указатель основных работ ученого, а также публикации о нем.

Издание предназначено широкому кругу библиотечных работников, ученых, преподавателей и студентов.

# КАЛЯНДАРНЫ ПЛАН
## выхаду ў свет інфармацыйных выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 2021 г.

| № п/п | Выданне | Адказны за выпуск | Выхад у свет |
|---|---|---|---|
| | *ДРУКАВАНЫЯ* | | |
| 1 | Беларусь вачыма бібліёграфа | Градоўкіна І.У. | Студзень |
| 2 | Бібліятэчны веснік: зборнік артыкулаў. Вып. 13 | Пшыбытка М.Г. | Кастрычнік |
| 3 | Бібліятэчны свет: часопіс | Кірухіна Л.Г. | 1 раз у 2 месяцы |
| 4 | Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 24 | Гарковіч Н.В. | Чэрвень |
| 5 | Интегрированные информационно-поисковые системы и сервисы библиотек. Серия «БиблиоКонсультант», вып. 10 | Рысева Ж.С. | Кастрычнік |
| 6 | Інструкцыя па ўліку і захаванасці фондаў нацыянальнай бібліятэкі беларусі. Серыя «БібліяКансультант», вып. 11. | | Кастрычнік |
| 7 | Краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк: ствараем супольна і якасна. Серыя «БібліяКансультант», вып. 12. | Пугачова С.А. | Лістапад |
| 8 | Материалы VIII Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры» | Есіс Н.С. | Кастрычнік |
| 9 | Матэрыялы XVII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў | Гарковіч Н.В. | Май |
| 10 | Новыя кнігі: па старонках беларускага друку | Градоўкіна І.У. | Кожны месяц |
| 11 | «Роман Степанович Мотульский»: биобиблиографический указатель | Суша А.А. | Жнівень |

ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
ВЫПУСКУ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ВЫДАННЯЎ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ
на 2021 год

Падпісана да друку 21.12.2020. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$. Лічбавы друк.
Умоўн. друк. арк. 0,70. Ул.-выд. арк. 0,45.
Заказ 1009.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/398 ад 02.07.2014.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/157 ад 02.07.2014.

Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск.
Тэл. (+375 17) 293 27 68.
Факс (+375 17) 368 97 23.
E-mail: edit@nlb.by.